# якому трэба будзе прадоўжыць гістарычны шлях Беларусі»

Аляксандр Лукашэнка таксама пералічыў апоры для чалавека, на якія арыентаваў і сваіх дзяцей не як Прэзідэнт, а як бацька: займацца спортам, ведаць англійскую мову, займацца музыкай (ці іншыя творчыя навыкі) і вучыцца. І абавязкова праца. «Не зазнавайцеся. Нідзе і ніколі», — параіў ён. Кіраўнік дзяржавы пажадаў сучасным і будучым студэнтам выбраць правільную любімую справу: «Галоўнае, каб ты ішоў туды, дзе ты можаш больш карысці прынесці і што табе будзе падабацца. Бяда, калі ідзеш на працу, а ісці не хочацца, ногі не ідуць. Праца павінна быць у задавальненне».

### Людзі ствараюць міф вакол першых асоб — чаму ў Аляксандра Лукашэнкі няма куміраў

У Прэзідэнта спыталі, ці былі ў яго жыцці настаўнікі, якія дапамагаюць і накіроўваюць. «Калі шчыра, не. Я першы прэзідэнт Беларусі — на каго я буду раўняцца, калі прэзідэнтаў да мяне не было», — наўпрост адказаў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што нават не можа адказаць на пытанне, хто з гістарычных асоб больш падабаецца. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што раней называў Шарля дэ Голя, палітычнага дзеяча, які шмат зрабіў для Францыі. Але, стаўшы Прэзідэнтам, шмат чаго даведаўся з рэальнага жыцця прэзідэнтаў. «Людзі ствараюць нейкі міф вакол першых асоб. Бывае, перабольшваюць. Не такія героі прэзідэнты, як звычайным людзям часам гэта здаецца, і нават не звычайным», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. І як гісторык па адукацыі ён звярнуў увагу, што часта гістарычных асоб, асабліва першых асоб дзяржавы, схільныя ідэалізаваць. У прыклад ён прывёў асобу Уладзіміра Леніна. «Я лічыў, што Ленін ідэальны чалавек, стваральнік дзяржавы. А калі я стаў прэзідэнтам і шмат чаго прачытаў, з архіва прачытаў, зразумеў, што там стварылі выяву. Хоць ён, вядома, велічыня, ён разумнік. Ён быў настолькі разумным і адукаваным чалавекам, што тэорыю лёгка на практыку пераносіў. Я яго вельмі паважаў. А калі больш даведаўся — перастаў ідэалізаваць», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка. Тое ж самае датычыцца і Іосіфа Сталіна, і Лаўрэнція Берыі, якія прызвычаіліся абвінавачваць у жорсткіх рэпрэсіях, забываючыся пра карысць, якую яны прынеслі краіне. Ён заклікаў акуратна ставіцца да гісторыі, таму што яе часта «робяць» пад той момант, калі жылі тыя ці іншыя лідары і кіраўнікі дзяржаў. «Тое, ад чаго я спрабую зберагчы наша пакаленне. Асабліва інтэлігенцыю. Таму я інтэлігенцыю ніколі не захвальваю, не гладжу, грашыма не спакушаю. Ні ў якім разе», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, інтэлігенцыя схільная хваліць, узнімаць, а потым новы прэзідэнт будзе «на калена ламаць інтэлігенцыю», каб яны ўзнімалі ўжо яго перыяд працы.

«Трэба спакойна ўспрымаць гэту рэчаіснасць. Няхай лепш пра мяне добра скажуць, калі я не буду Прэзідэнтам. Гэта будзе добра. А калі ты ва ўладзе, пачынаюць цябе захвальваць тваё надначаленыя — я няёмка сябе адчуваю, нават калі разумею, што гэтага заслугоўваю», — прызнаўся кіраўнік дзяржавы.

### Веды і патрыятызм — якім павінен быць ідэальны студэнт

Сярод пытанняў былі і філасофскія. Напрыклад, хто такія ў разуменні Прэзідэнта настаўнікі. Па словах кіраўніка дзяржавы, настаўнік павінен не толькі даць веды, але і паказаць, як прымяняць іх на практыцы, паказаць, як трэба жыць. Па просьбе ўдзельнікаў мерапрыемства, Аляксандр Лукашэнка падзяліўся сваім бачаннем ідэальнага студэнта: «Студэнт — гэта перш за ўсё веды. Па-другое — выхаванне. Вы павінны быць адукаванымі, наколькі гэта толькі магчыма. Галоўнае — быць патрыятычным чалавекам», — заявіў беларускі лідар. Ён даў яшчэ адну параду маладым — усё рабіць своечасова: «Таму што час пройдзе — у цябе з'явяцца новыя клопаты, новыя праблемы. З'явіцца сям'я, дзеткі, і табе вучыцца трэба будзе, бо ўсё жыццё трэба вучыцца, але часу ўжо менш. І ты павінен ведаць, што твая зямля тут. Ты яе ведаеш, ты яе разумееш». Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што сёння многія, хто з'ехалі за мяжу, просяцца назад, бо тут дом, а там яны чужыя, нікому не патрэбныя.

Працягваючы тэму студэнцтва, у Прэзідэнта пацікавіліся, якія стравы былі яго любімымі падчас вучобы ва ўніверсітэце. «Нічога дзіўнага. Малочны суп. Я вельмі шмат гаварыў аб гэтым раней. Цяпер я малочны суп практычна не ўжываю. Гавораць, суп з агародніны трэба есці», — адказаў кіраўнік дзяржавы. Ён расказаў, што гэта павялося яшчэ з вясковага жыцця, калі ў беднай сям'і самай даступнай ежай якраз быў малочны суп з рысам. Яшчэ Прэзідэнт любіць чорны хлеб.

Маладыя людзі згадалі і знакамітую салату «Маладосць», рэцэптам якой кіраўнік дзяржавы дзяліўся з усёй краінай. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што навукоўцы адзначылі карысць гэтай салаты, якая складаецца са свежай зялёнай цыбулі, агуркоў і смятаны. Ён прызнаўся, што любіць тое, да чаго прывык з дзяцінства. А да розных замежных прысмакаў ставіцца спакойна. «У нас дома ікру ніхто не есць», — прывёў ён прыклад.

Асабістых пытанняў было нямала. Студэнты спыталі, ці ёсць у Аляксандра Лукашэнкі мабільны тэлефон. «Няма і ніколі не было. Па многіх прычынах. Па-першае, мне гэта не трэба. Для таго каб перагаварыць (я вельмі рэдка па мабільным тэлефоне размаўляю), у мяне ёсць Служба бяспекі. У яе і ўрадавая сувязь, і тэлефоны ўсе — яны мне даложаць, я перагавару», — адказаў ён. Па яго словах, пра тое, што пішуць у інтэрнэце, таксама ёсць каму расказаць. Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы не карыстаецца мабільным тэлефонам з-за пытанняў бяспекі.

Аляксандр Лукашэнка шчодра дзяліўся са студэнтамі сваімі ўспамінамі. Так, ён расказаў пра свае адчуванні, калі губернатар Магілёўскай вобласці Анатоль Ісачанка падарыў яму сшытак, які будучы Прэзідэнт вёў падчас працы ў саўгасе. «Я адчуў, што гэта самы лепшы падарунак, які мне даставўся. Гэта рабочы сшытак», — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што сёння, аналізуючы тыя запісы, бачыць, што яго хвалявалі многія дзяржаўныя пытанні: колькі мяса павінен прадаць, колькі малака, а дзе чаго не выконваем. У тым жа сшытку змешчаны і тэзісы для выступленняў на розных мерапрыемствах. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што шмат у чым гэта былі «апазіцыйныя тэзісы», у якіх ён жорстка адстойваў сваю пазіцыю і выказваў меркаванні па тых ці іншых пытаннях. Прэзідэнт расказаў, што прамы і шчыры падыход да абмеркаванняў найважнейшых дзяржаўных пытанняў, прынцыповае адстойванне сваёй пазіцыі дапамаглі яму зрабіць такую палітычную кар'еру.

### Галоўнае — гэта цярпенне. Прэзідэнт расказаў, як быць палітыкам

Палітычныя парады ад Прэзідэнта таксама цікавілі маладых людзей. Адно з пытанняў — як адрозніць праўду ад хлусні. «І не спрабуйце гэта рабіць. Вы ніколі не адрозніце. Таму што палітыка — гэта калі не хлусня, то пэўнае замоўчванне, недаказанасці. Палітыка — гэта тое, што робяць палітыкі (прабачце за таўталогію) для таго, каб яму самому, пэўнай групе ці народу было лепей», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён адзначыў, што сам не хлусіць, але часам недагаворвае ці ўвогуле не выказвае свайго меркавання. «Я прыхільнік шчырай палітыкі. Прабачце за нясціпласць, але палітыкаў практычна няма такіх», — падкрэсліў беларускі лідар. Па яго словах, гэта правільна, але ў той жа час шчырыя выказванні могуць быць не на карысць. «У палітыцы часам лепш хлусню і праўду не шукаць. Гэта месцамі так пераплецена», — заўважыў ён.

Яшчэ адно палітычнае пытанне — як не паддавацца на правакацыю. «Трэба, па-першае, разумець сітуацыю і прадмет. А падругое, не спяшацца. Вось цярпенне — гэта самае галоўнае. Я не ўзор у гэтым плане. Я больш эмацыянальны: наперад, на барыкады, трэба ўвязацца ў бойку, а потым разбяромся. Часам так было. Але з узростам я ўжо так думаю: не, трэба перачакаць, трэба паглядзець, потым будзе відаць», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што ў гэтым заключаецца беларуская памяркоўнасць. «Памяркоўнасць не нашкодзіць — гэта не заўсёды дрэнна. Але часам тармозіць прагрэс. Таму я перыядычна так і сяку з-за пляча. Галоўнае — цярпенне», — перакананы кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт прызнаўся, што сам, калі нешта не поўнасцю разумее ў пэўнай сітуацыі, то, перш чым прыняць рашэнне, дасканала разбіраецца. А для гэтага патрэбна цярпенне. Нават калі вельмі складана. Ён прывёў у прыклад сітуацыю з пратэстамі 2020 года ў Мінску. Тады Прэзідэнту прапаноўвалі розныя варыянты дзеянняў, у тым ліку заклікалі «паказаць ім, хто там ходзіць, каля Палаца Незалежнасці». «Я кажу: спакойна. Я разумею, што, калі яны галоўны цэнтр улады захопліваюць, гэта ўжо сігнал усім, народу, што ўлада памянялася. Я гэта разумеў. Але я адчуваў: спакойна, не трэба спяшацца. Вось яны хадзілі-хадзілі... Але калі мы іх пужнулі каля Палаца Незалежнасці, яны зразумелі, што тут жарты скончыліся — аўтаматы ў руках. Але ж мы ні ў кога не стралялі. Вытрымка, вытрымка — да апошняга», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Падобная сітуацыя разгарнулася і падчас пандэміі, калі некаторыя кіраўнікі на ўсе галасы прапаноўвалі закрываць прадпрыемствы, арганізацыі, установы, закрывацца на лакдаўн. Але Беларусь на гэта не пайшла, абрала свой шлях. «Тое, што такіх, як мы, Беларусь, залежных і ад рэсурсаў, сыравіны, ад рынкаў, хацелі проста развaліць, разбурыць і некуды далучыць — гэта факт», — упэўнены кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, што сваім рашэннем забараніў Міністэрству аховы здароўя закрываць арганізацыі і прадпрыемствы, запатрабаваўшы ў першую чаргу займацца сваім галоўным абавязкам — лячыць людзей. І тут таксама нічога б не атрымалася без цярпення. «Адзіная ў свеце краіна — мы пайшлі сваім шляхам. Мы лячылі людзей, ратавалі. Я сам хадзіў па гэтых рэанімацыях. Дзе толькі я не быў», — нагадаў беларускі лідар. Ён падкрэсліў, што сапраўдны корань хваробы часта хаваецца менавіта ў галаве. «Вось чым традыцыйная кітайская медыцына моцная: не сякера і скальпель, а менавіта псіхалогія, яшчэ нешта, харчаванне, паветра, вада і гэтак далей, пра што я вам казаў. А астатняя маніпуляцыі, без якіх, вядома, не абысціся — вось там урачы. Яны цуды цяпер навучыліся тварыць — нашы беларускія ўрачы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Вяртаючыся да пытання аб тым, як пазбегнуць правакацый, кіраўнік дзяржавы рэзюмаваў: «Трэба ведаць прадмет і не трэба спяшацца. Не трэба спяшацца. Мая вам парада. Ніколі не спяшайцеся. Сцісніце зубы і цярпіце, глядзіце, пакуль не пераканаецеся, у сілу свайго вопыту і ведаў, правільна вы вырашылі паступіць ці не».

Паколькі размова была шчырая і адкрытая, Аляксандр Лукашэнка расказаў, што самае складанае ў жыцці Прэзідэнта: «Самае складанае — гэта давер. Людзі табе вераць, давяраюць, яны за табой ідуць. Гэта самае складанае, гэта самае цяжкае. Няма нічога складанейшага за абавязак перад людзьмі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Таму, па яго словах, Прэзідэнт вымушаны пастаянна думаць аб працоўных пытаннях, паколькі ў полі зроку кіраўніка дзяржавы знаходзяцца ўсе аспекты жыцця краіны — таму ўсё навокал датычыцца яго працы.

Асаблівa пытанні бяспекі, якія сёння стаяць найбольш востра. Аляксандр Лукашэнка назваў захаванне бяспекі дзяржавы адной з найважнейшых задач Прэзідэнта. Ён папярэдзіў, што парушаць граніцу Беларусі нікому не дазволена. «Вось там маленькая Беларусь... Якая яна маленькая? Гэта вялікая Беларусь, у якой жывём мы, беларускі народ. Для мяне ён вялікі, я павінен яго абараняць. Вы вялікія людзі для мяне, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Вядома, не дай бог на чырвоную кнопку націскаць, але мы краіна — мы больш не жадаем пад бізуном хадзіць, мы больш не жадаем у лапцях хадзіць. Мы дастаткова разумныя, наш народ таленавіты. І самае галоўнае — мы ж ні ў кога нічога не просім. Адчапіцеся ад нас. Вось наша зямля, мы хочам тут жыць».

### Чаму рабочыя спецыяльнасці найважнейшыя

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сёння ва ўсіх беларусаў роўныя магчымасці. Паступленне ў ВНУ больш не ўспрымаецца як прывілея — цяпер атрымаць вышэйшую адукацыю можа кожны. Дапамагае ў гэтым і мэтавае накіраванне. Але, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, мэтавікі павінны выконваць умовы дагавора і пасля вучобы прыходзіць на працу ў арганізацыю, якая выдала мэтавае накіраванне. Ён таксама падкрэсліў, што бясплатнае навучанне — зусім не бясплатнае, за гэта плаціць дзяржаўны бюджэт. «Дзяржава рыхтуе сабе спецыялістаў і накіроўвае туды, куды дзяржаве патрэбна. Якія могуць быць скаргі на тое, што дзяржава размяркоўвае? Радавацца трэба, што ёсць першае месца працы», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Ён яшчэ раз падкрэсліў, што не трэба імкнуцца ў сталіцу. Камфортна жыць можна і ў рэгіёнах, тым больш што ўмовы створаны. Галоўнае — працаваць і не марнаваць час.

Тэму падрыхтоўкі маладых спецыялістаў працягнулі і самі студэнты. Яны спыталі меркаванне Прэзідэнта наконт таго, як павысіць цікавасць моладзі да інжынернай справы і зрабіць яе такой жа прэстыжнай, як IT-спецыяльнасці. Па словах кіраўніка дзяржавы, для гэтага патрэбна дастойная заработная плата і павышэнне аўтарытэту інжынераў у грамадстве. Тым больш што значнасць IT завышана — па словах беларускага лідара, «айцішнікамі» ў той ці іншай ступені сёння могуць сябе назваць многія, таму што ўся моладзь умее карыстацца гаджэтамі, камп'ютарамі. «Айцішнікі ўсе, а інжынераў мала, дэфіцыт. Адсюль і прэстыжнасць», — заўважыў ён. Аляксандр Лукашэнка лічыць, што для сям'і, для штодзённага жыцця інжынерная спецыяльнасць больш важная. Бо людзі гэтай прафесіі валодаюць важнымі практычнымі ведамі і ўменнямі.

«Мы крыху адхіліліся ў гэтым плане, дысбаланс у нас. Мы будзем інжынерныя, рабочыя спецыяльнасці ўзнімаць на самы высокі ўзровень. Таму што гэта дзяржаве трэба, гэта стратэгія, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Калі мы гэтым не будзем займацца цяпер, то заўтра будзе не да гаджэтаў».

### «У нас вучыцца трэба, як шанаваць сваё мінулае»

Удзельнікі мерапрыемства не пакінулі без увагі і іншыя тэмы, актуальныя для ўсёй краіны. Напрыклад, захаванне гістарычнай памяці. У Прэзідэнта спыталі, якія меры трэба прыняць, каб зрабіць гэту працу больш эфектыўнай, не дапусціць паўтарэння тых жудасных падзей і аб'яднаць народы дзеля захавання міру.

«Без лішняй сціпласці скажу: з тым, што робіць Беларусь і беларусы, ніводны народ параўнацца не можа. Па-мойму, мы ўжо зрабілі столькі, што, здаецца, і рабіць больш не трэба. На нашым прыкладзе трэба вучыцца, як быць прыхільным гэтаму, як гэта ўсё шанаваць», — адказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што ў сярэдзіне 1990-х у Беларусі збіраліся зносіць помнікі і пераназываць вуліцы. Аднак да гэтага не дайшлі. «У нас вучыцца трэба, як шанаваць сваё мінулае. Мы павінны гэтым шляхам ісці. У нас заўсёды так бывае: а ўсё добра, ды ўсё выдатна, рукі апусцілі, ды не трэба нічога рабіць — само прыйдзе. І мы зноў або адкоцімся куды, або абрынемся. Таму не трэба гэта забываць. І я, бываючы ў Хатыні, на плошчы Перамогі, заўсёды кажу людзям: прыходзьце да помнікаў і прыводзьце сюды сваіх дзяцей», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

### «Я адчуў будучыню нашай краіны»

У заключэнне Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што гэтае мерапрыемства для яго вельмі важнае. «Я вырашыў сёлета сустрэцца з прадстаўнікамі, студэнтамі нашых ВНУ, каб ім расказаць, каб у адкрытай размове яны адчулі, чым жыве краіна», — адзначыў ён. Прэзідэнт расказаў, што як чалавеку, які прымае ключавыя рашэнні па развіцці Беларусі, важна атрымаць зваротную сувязь ад прадстаўнікоў студэнцтва, даведацца, якія настроі, памкненні ў маладых людзей. «Я адчуў, чым вы жывяце. А вы — будучыня. Значыць, я адчуў будучыню нашай краіны», — падзяліўся ўражаннямі беларускі лідар.

На памяць аб гэтай важнай сустрэчы Аляксандру Лукашэнку ад усёй студэнцкай моладзі Віцебскай вобласці падарылі шахматы з масіву дуба ручной работы, якія сімвалізуюць гісторыю Прыдзвіння. Як было абяцана, яны зоймуць сваё месца ў Палацы Незалежнасці. Магчыма, пасля гэтай паездкі Прэзідэнта ў Віцебск, у Палацы Незалежнасці з'явіцца яшчэ адно ноу-хау — кіраўніку дзяржавы вельмі спадабалася прадстаўленне батлейкі, якім яго сустракалі ў фае ўніверсітэта. Ён дарычы падумаць над тым, каб такім жа чынам сустракаць гасцей Палаца Незалежнасці.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

*Віцебск.*